Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# МАТУЛІНЫ ПАМАГАТЫЯ
загадкі пра бытавую тэхніку, посуд

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна,
выхавальнік дашкольнай адукацыі
1 кваліфікацыйнай катэгорыі

аг. Грыцкевічы, 2022

Мэта: выхоўваць цікавасць да паходжання слова, жаданне пазнаваць, што азначае слова.
Па тканаму мору жалезны карабель плыве,
Мора пад ім шуміць, услед высыхае.
Сам жа карабель тады кранецца,
Як да сцяны прыпрэцца. (Электрычны прас.)

Яна на яго злосна бурчэла,
Кідала яго і вярцела.
Яно ж пасля гэтага Памаладзела. (Пральная машына.)

Мае колы — ды не паравоз,
Мае стужку, але не матрос.
Музыкай частуе ён, А завуць... (Магнітафон.)

Я не чарапаха — робат,
Але працаваць люблю,
Я не слон, але ў свой хобат
З дывана ўвесь пыл лаўлю. (Пыласос.)

Пыл ўбачу-заварчу,
Завярчу і праглыну! (Пыласос)

У яе спачатку бялізну загружай,
Насып парашок і ў разетку уключай,
Праграму для мыцця задаць не забудзься,
А пасля ты можаш пайсці адпачыць. (Пральная машына)

Пар пусціў дракон хвастаты і разгладзіў шалік мяты. (Прас)

Жывуць там розныя прадукты,
Катлеты, гародніна і садавіна.
Смятана, вяршкі і каўбасы,
Сасіскі, малако і мяса. (Халадзільнік)

Праз палі, масты, лясы
Ляцяць словы – галасы.
Дзякуючы правадам
Кажуць тут, а чуюць там.(Тэлефон)

Языка не мае, а гаворыць і спявае. (радыё)

Два кальцы, два канцы, а пасярэдзіне цвік. (Нажніцы.)

Сівенькая, маленькая, а ўвесь свет абшывае. (Іголка.)

Між пяці бочак залаты вяночак. (Пярсцёнак.)

З ёй спаткаешся тады,
Як захочацца вады,
І цалуеш ты яе
Кожны раз, як піць дае. (Шклянка.)

Напіўся, наеўся, На агонь усеўся, Кашу зварыў І нас накарміў. (Гаршчок.)

Увесь свой век ходзіць, а з месца не сходзіць. (Гадзіннік.)

На страсе жораў стаіць, у хаце на стале скрыпка стаіць, у пакоі святло патушана, а ўвесь свет відаць. (Тэлевізар.)

**Дыялогі з прыказкамі ці прымаўкамі**

- Мама, пашый маёй лялцы сукеначку. - Сама, дзяўчынка, паспрабуй. - Я не ўмею. - Не святыя гаршкі лепяць. Пастарайся і зробіш.

- Бабулька, ты казала, што мы пойдзем гуляць. - Пойдзем, унучка, але скажы, ці памыла ты ўжо посуд? - Я потым памыю. - Не. Адклад не ідзе ў лад. Памый чысценька посуд, а тады і пойдзем.

- Мама, хутчэй канчай прасаваць, пойдзем у грыбы, а то сцямнее. - Спяшыць — людзей насмяшыць. Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра. Яшчэ паспеем і грыбоў назбіраць.

- Сёння ў нас у хаце ні мукі пылінкі, ні солі драбінкі. - Я зараз, матуля, збегаю ў краму і ўсё, што трэба, куплю.